**ПАДЛІПСКАЯ Зоя Іванаўна**, беларуская паэтэса. Нарадзілася ў 1964 г. у в. Сярагі (пас. Манькова). Скончыла Сяражскую школу, Слуцкае медыцынскае вучылішча (1983), Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт (1994), аспірантуру пры БДПУ імя М. Танка (2003). У Слуцку працавала медсястрой, выхавальнікам, настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў СШ № 10, арганізатарам па выхаваўчай рабоце аддзела адукацыі гарвыканкама. Пераехала ў Мінск і працавала ў абласным інстытуце павышэння кваліфікацыі навуковым супрацоўнікам лабараторыі тэорыі і методыкі навучання мовам і літаратуры Нацыянальнага інстытута адукацыі, з 2009 г. - галоўны рэдактар часопіса «Роднае слова». Друкавалася ў ЛІМе, часопісах «Полымя», «Маладосць», «Роднае слова», «Першацвет», зборніках «Нас слова Купалы да творчасці кліча» (1995,1997), «Прызнанне ў любові і каханні» (2005) і інш. Аўтар кніг паэзіі «Палон нябёсаў» (1998), «У вэлюме завей» (2005), вучэбнага выдання «Вобраз часу праз прызму беларускай філасофскай лірыкі апошняй чвэрці XX стагоддзя» (2002), вучэбна-метадычнага дапаможніка «У дапамогу настаўніку беларускай мовы і літаратуры» (2003) і інш.

Памяць : Слуцкі раён. Слуцк.
Кн. 3 / уклад. В. С. Відлога ;
маст. Э. Э. Жакевіч. — Мінск, 2015. —
С. 585—586.